*Лакацыі актыўнасці*

Абвешчаны «Фермеры-пачаткоўцы» 2022 года

# У ВЁСЦЫ ЖЫЦЬ — У СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ БЫЦЬ!

**Расійскі саюз сельскай моладзі ў анлайн-фармаце правёў фінал бізнес-гульні «Фермер-пачатковец». У завочным этапе спаборніцтва прынялі ўдзел больш як сто каманд з Расіі, Беларусі, Арменіі, Казахстана і Кыргызстана. У фінал было адабрана 59 найлепшых праектаў у чатырох катэгорыях: 23 — з ВНУ, 17 — з сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, 12 — са школ і сем каманд маладых прадпрымальнікаў, якія вядуць сваю дзейнасць у сферы аграпрамысловага комплексу.**



У фінал міжнароднай бізнес-гульні «Фермер-пачатковец» ад Беларусі прайшлі дзевяць маладзёжных праектаў. У краіне адбыліся тры абарочныя туры. У першым нацыянальным прынялі ўдзел 80 заявак, у другі тур прайшлі 36. У трэцім, міжнародным, былі разгледжаны 20 заявак ад беларусаў.

У выніку ў міжнародным фінале Беларусь прадстаўлялі наступныя праекты — «Адкрыццё цяплічнага комплексу «Ягадніца» (аўтар — магістрант эканамічнага факультэта Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі Ганна Бандарэнка), GORKI'S HONEY (аўтар — студэнт першага курса эканамічнага факультэта БДСГА Энгін Макейчык), «Мова грыбоў» (аўтар — студэнт чацвёртага курса факультэта камерцыі і фінансаў Беларускага гандлёва-эканамічнага ўніверсітэта спажывецкай кааперацыі Арцём Скаромны), «Вёска будучыні» (аўтар — першы сакратар Браслаўскага раённага камітэта БРСМ Алена Гасюль), «Вырошчванне і рэалізацыя ядомых каштанаў» (аўтар — навучэнка другога курса Маладзечанскага гандлёва-эканамічнага каледжа Белкаапсаюза Уладзіслава Гардзей), «Сялянска-фермерская гаспадарка «Бацькаў дар» (аўтар — навучэнка трэцяга курса эканамічнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага аграрна-эканамічнага каледжа Карына Махавікова), «Ажыццяўленне фермерскай дзейнасці па вырошчванні грэчкі» (аўтар — навучэнец трэцяга курса Бабруйскага дзяржаўнага аграрна-эканамічнага каледжа Андрэй Пачарняеў), «Рацыянальнае выкарыстанне цыбульных раслін на прыкладзе Tulipa hibrida» (аўтар — настаўніца біялогіі СШ № 8 Крычава Ірына Кісялёва), а таксама праект школьнай стартап-кампаніі «Пакаленне ЭкаАгра» (аўтар — настаўніца біялогіі Барсукоўскай сярэдняй школы Смалявіцкага раёна Надзея Паўленка).

Пераможцаў вызначыла конкурсная камісія, прадстаўленая экспертамі з Мінсельгаса Расіі, галіновых саюзаў, навуковай супольнасці, бізнес-структур у сферы аграпрамысловага комплексу, а таксама банкаў і іншых кампетэнтных арганізацый.

Сярод каманд ВНУ адным з лідараў стаў праект, у прыватнасці, Арцёма Скаромнага з Беларускага гандлёва-эканамічнага ўніверсітэта спажывецкай кааперацыі па вырошчванні грыбоў вешанак.

Сярод ССНУ на другім месцы апынуўся праект каманды з Гомельскага дзяржаўнага аграрна-эканамічнага каледжа, накіраваны на стварэнне сялянска-фермерскай гаспадаркі, якая спецыялізуецца на вытворчасці прадукцыі раслінаводства і пчалярства, аказанні аграэкскурсійных паслуг.

У катэгорыі каманд маладых людзей, якія маюць досвед вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі не менш за тры гады і/ці прадпрымальнікаў, што вядуць сваю дзейнасць у сферы аграпрамысловага комплексу, спецыяльны прыз атрымаў праект «Вёска будучыні» на чале з першым сакратаром Браслаўскага раённага камітэта БРСМ Аленай Гасюль.

У катэгорыі школьнікаў першае месца заняў праект з Беларусі пад назвай «Рацыянальнае выкарыстанне цыбульных раслін на прыкладзе Tulipa hibrida». Дзеці прапанавалі прадоўжыць жыццё цюльпанаў да жаночага свята 8 Сакавіка да дзесяці дзён за кошт вырошчвання ў вазонах з пажыўным растворам. Спецыяльны прыз у гэтай жа катэгорыі атрымала Барсукоўская сярэдняя школа Смалявіцкага раёна за стартап-кампанію «Пакаленне ЭкаАгра».

Гульня на тэрыторыі Беларусі была арганізавана БРСМ пры падтрымцы Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, Міністэрства адукацыі Беларусі і Расійскага саюза сельскай моладзі, які аказаў кансультацыйную дапамогу ў яе правядзенні.

Нагадаем, праект накіраваны на развіццё ва ўдзельнікаў навыкаў бізнес-планавання ў сельскай гаспадарцы, збору і аналізу інфармацыі, выпрацоўкі кіраўнічых рашэнняў і ўмення працаваць у камандзе.

Фіналісты павінны былі валодаць ведамі асноў эканомікі і кіравання сельскагаспадарчай арганізацыяй, праграм, накіраваных на падтрымку фермерскіх гаспадарак, быць здольнымі кіраваць сельскагаспадарчай арганізацыяй ва ўмовах канкурэнцыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Новыя старты*

# Пра «Сілу закона» ведаць з дзяцінства

**Рэспубліканскі прававы турнір для старшакласнікаў пад такой назвай стартуе сёння.**

Інтэлектуальнае спаборніцтва прымеркавана да Дня юрыста і накіравана на паглыбленае вывучэнне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Яно пройдзе ў тры туры ў фармаце анлайн-тэсціравання на Дзіцячым прававым сайце: раённы этап — з 1 да 6 снежня, абласны (Мінскі гарадскі) — 14 снежня. Імёны пераможцаў турніру назавуць 21 снежня паводле вынікаў рэспубліканскага фіналу.

Падрыхтоўку і правядзенне II Рэспубліканскага прававога турніру для старшакласнікаў «Сіла закона» забяспечвае Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі сумесна з Міністэрствам адукацыі і Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі. Суарганізатарамі праекта выступаюць Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Беларускі рэспубліканскі саюз юрыстаў, Беларуская рэспубліканская калегія адвакатаў і Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі Следчага камітэта.

Як адзначылі арганізатары турніру, у Беларусі на дзяржаўным узроўні ўдзяляецца вялікая ўвага фарміраванню прававой культуры грамадзян, у тым ліку дзяцей і моладзі. Важна закладваць разуменне прававых асноў, а таксама неабходнасць захавання законаў з дзяцінства, таму рэалізуецца шэраг сумесных праектаў па гэтым напрамку.

Рэспубліканскі прававы турнір «Сіла закона» з'яўляецца адным з найбольш маштабных. Ён накіраваны на павышэнне цікаўнасці старшакласнікаў да заканадаўства, прапаганду прававой культуры, паглыбленне ведаў, якія датычацца правоў і абавязкаў непаўнагадовых. Першы рэспубліканскі прававы турнір «Сіла закона» прыцягнуў летась увагу больш як 16 тысяч старшакласнікаў з розных рэгіёнаў Беларусі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «НАЗАД ДАРОГІ ЎЖО НЕ БУДЗЕ»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)***

А першы вопыт кансультавання быў атрыманы яшчэ ў канцы трэцяга курса.

— Аднойчы мне напісаў стары знаёмы, з якім мы не былі асабліва дружныя (псіхолаг па этычных прычынах не можа кансультаваць сяброў і родных. — **Рэд.**). Ён прасіў парэкамендаваць яму псіхолага. Я вырашыла, што гэта мой шанц атрымаць практычныя навыкі і параіла яму... сябе. У мяне было мала вопыту, але я рабіла гэта бясплатна.

**У большасці псіхолагаў ёсць асабістая тэрапія. І гэта вельмі важны элемент з прафесійнага пункту гледжання. Бо, каб якасна дапамагчы кліентам, неабходна спачатку разабрацца ў сабе.**

Работа ў клініцы і кансультацыі з кліентамі — зусім розныя па сваёй спецыфіцы. Калі ў медустанове наша гераіня займаецца пераважна дыягностыкай, то падчас кансультацый з кліентамі разбірае праблемныя сітуацыі і дапамагае шукаць выхады з іх. Аляксандра прызнаецца, што працаваць у клініцы значна складаней:

— Нярэдка сустракаюцца пацыенты, якія не ідуць на кантакт. Калі да цябе звяртаецца першапачаткова заматываваны на дапамогу пацыент, ты яму не даеш. У клініцы ж бывае так, што чалавек не жадае лячыцца. І ўсе спробы пагаварыць, даведацца, як ён сябе адчувае, асуджаныя на правал.

Нягледзячы на тое, што Аляксандра лічыць прафесію псіхолага вельмі цікавай, шматграннай і гуманнай, ёсць тое, што яе сапраўды абурае, — абясцэньванне спецыяльнасці.

— Многія лічаць, што для гэтага не патрэбна адукацыя, што чалавек, які праслухаў двухгадзінны вэбінар, ужо можа лічыцца псіхолагам, — дзеліцца думкамі гераіня. — Таксама мне не падабаецца, што для некаторых псіхалогія і эзатэрыка — амаль сінонімы. Я хацела б, каб людзі размяжоўвалі гэта і разумелі, якую адказнасць нясуць прадстаўнікі той і другой сферы.



Трэба адзначыць, што муж Аляксандры таксама псіхолаг. Больш за тое, яны працуюць у адной клініцы, толькі ў розных аддзяленнях. На пытанне аб прафесійнай канкурэнцыі ўнутры сям'і дзяўчына адказвае наступнае:

— Я ўвогуле за тое, каб аб'ядноўвацца і ладзіць тандэм. Для мяне мой муж не канкурэнт, а калега і саюзнік.

А як жа складваюцца міжасобасныя адносіны ў сям'і псіхолагаў? Мабыць, сужэнцы ніколі не сварацца? Канешне, прафесійныя веды дапамагаюць правільна вырашаць канфлікты. Але, па словах Аляксандры, гэта зусім не панацэя.

— У нас быў досвед звароту па кансультацыю да сямейнага псіхолага, — прызнаецца гераіня. — У стане стрэсу мы перастаём быць псіхолагамі, а становімся звычайнымі людзьмі са сваімі пачуццямі.



Не трэба здзіўляцца. У большасці псіхолагаў ёсць асабістая тэрапія. І гэта вельмі важны элемент з прафесійнага пункту гледжання. Бо, каб якасна дапамагчы кліентам, неабходна спачатку разабрацца ў сабе.

Мы спыталі ў Аляксандры, што б яна параіла абітурыентам, якія разважаюць над тым, звязваць сваё жыццё з псіхалогіяй ці не.

— Звязвайце — гэта вельмі крута, — упэўнена адказвае дзяўчына. — Аднак трэба разумець, што назад дарогі ўжо не будзе. Можна не займацца практыкай, але калі ты дастаткова развіты, то ўжо інакш будзеш глядзець на гэты свет.

Таксама гераіня дала параду сваім калегам:

— Я часта бачу, як маладыя псіхолагі, якія трапляюць у садкі і школы па размеркаванні, вельмі хутка выгараюць і расчароўваюцца ў прафесіі. Але заўжды можна паспрабаваць сябе ў іншых напрамках: гэта могуць быць работа ў медустановах, прыватная практыка, навука. Не варта спяшацца сыходзіць з прафесіі, калі першы вопыт быў няўдалы.

**Лізавета ГОЛАД.**

**Фота з архіва гераіні.**